Дакл. т. Каплан.

Пралятары усіх краін, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА.

Не падлягае агалашэньню.

# Пратакол № 50

## АБ‘ЯДНАНАГА ПАСЯДЖЭНЬНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ БССР

21-га чэрвеня 1930 г. — гор. Менск.

СТАРШЫНЯ СНК—т. **Галадзед М. М.**

**ПРЫСУТНІЧАЛІ:**

з пастаноўчым голасам: т. т. **Бэнэк** (Нам. Старшыні СНК), **Бунін** (НКФ), **Рачыцкі** (НКЗ), **Балцін** (НКГ), **Гнілякевіч** (НК Працы), **Бялуга** (НКА), **Цэнцыпер** (НК Аховы Здароўя), **Сташэўскі** (НК Юстыцыі), **Кроль** (НКУС), **Самойлаў** (НКСЗ), **Яцкевіч** (Галоўдартранс), **Леднік** (Уп. НКШ), **Каменяў** (Уп. НКП і Т), **Дубіна** (Галоўвыстаўком), **Хаскін** (Белкапсаюз), **Яршоў** (Белкантора Дзяржбанку), **Гольдберг** (Дзяржплян);

з дарадчым голасам: т. т. **Калевіч** (Кір. Спраў СНК і ЭН), **Дубавіцкі** (Нам. Кіраўніка Спраў СНК), **Фрыдман** (Рэд.,-Канс. СНК), **Пятровіч і Мачульскі** (ДПК), **Горын** (ПК), **Ластоўскі** (Бел. Кант. Саюзкалгасбанку), **Вожык** (НКА), **Масюкоў** (НКЗ), **Лацыс** (Белпаляводсаюз), **Чарняўскі** (ЭКАНА), **Захарава** (НК Працы);

Прадстаўнікі ведамстваў і дакладчыкі: т. т. **Лур‘е, Пагоскі, Дружалоўскі, Кулькін, Нісьневіч** (ВСНГ), **Турэцкі** (Лесбел), **Каплан, Брэсьлер, Рагінскі** (ДПК), **Найдус, Ракаў, Якаўлеў** (НК Гандлю), **Гантман** (НКШЗ), **Караткоў, Сяргейчык, Пінчук** (С-Г. Акадэмія), **Палякоў, Луцкевіч** (Белпайгандаль), **Левін** (Белжылсаюз), **Стахеяў** (Белдзяржстрах), **Лучышын** (ВСНГ), **Сьцепановіч, Васільлеў** (Белкапінсаюз), **Марон** (Саюзлес), **Сьвірыдаў** (Гомельскі АВК).

Сакратар СНК т. **Дубавіцкі.**

## Разглядалі — Пастанавілі:

**2472.** Сакрэтна.

**2473.** Сакрэтна.

**2474.** Пра падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў для прамысловасьці на 1929/30 г. Падае Дзяржплян, Дакл. т. Пятровіч. **Інд. 147/3.**

**2474.** 1. Адзначаючы, што ВСНГ на працяту больш 6 месяцаў бягучага бюджэтнага году праводзіў і фінансаваў цэлы шэраг мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў, ня маючы для гэтага зацьверджаных тытулаў і асыгнаваньняў, а таксама пляну і каштарысаў, і што такое становішча прыводзіць да зрыву цэлага шэрагу мерапрыемстваў, запрапанаваць ВСНГ ужыць безадкладныя захады да забясьпечаньня і часовага афармленьня адпаведных мерапрыемстваў на наступны год з тым, каб у будучым зьнішчыць такія зьявішчы.

2. Зацьвердзіць выдаткі ў разьмеры 1.520 тыс. руб. на наступныя мерапрыемствы, якія ўжо праводзяцца:

| МЕРАПРЫЕМСТВЫ | Лік курсаў | Тэрмін навуч. | Лік асоб |
|---|---|---|---|
| 1. Школы фабрычна-зав. вучнёўства | — | 2-3 г. | 1.460 |
| 2. Вячэр. курсы па профтэхадукацыі для рабочых і моладзі | 60 | 1 г. | 1.800 |
| 3. Курсы па рацыян. | 1 | 3 м. | 50 |
| 4. Субсыдыя курсам на падрых. дзесятнікаў-будаўнікоў | 4 | — | — |
| 5. Горныя курсы | 1 | 2 г. | 50 |
| 6. Субсыдыя курсам электраманц. | 1 | — | — |
| 7. Курсы малодшага пэрсаналу дрэваапрац. прамысловасьці | 1 | 6 м. | 60 |
| 8. Падрыхтоўка раб. швэйнікаў у Бабруйску, Віцебску і Гомелі | 3 | 3—6 м. | 1.760 |
| 9. Курсы для дзесятнікаў-тарпянікоў | 1 | 2 м. | 25 |
| 10. Кантрактацыя студэнтаў | — | — | — |

3. Студэнтам практыкантам плаціць па стаўках, вызначаных пастановаю НК Працы СССР, як заработак за іх працу з фонду зарплаты ў межах, зацьверджаных прамфінплянам.

4. Даручыць ВСНГ безадкладна прыступіць да правядзеньня наступных мерапрыемстваў з фінансаваньнем іх у разьмеры 480 тыс. руб.

**Разглядалі — Пастанавілі:**

15. Даручыць усім арганізацыям, якія крэдытуюцца ў Дзяржбанку, скончыць разлікі па дэбіторскіх і крэдыторскіх завінавачанасьцях у тэрміны, вызначаныя РСІ.
16. Запрапанаваць ВСНГ на працягу 4-га кварталу г. г. дыфэрэнцаваць балянсы аб'яднаньняў па паасобных прадпрыемствах з падзелам уласных сродкаў прамысловасьці на сродкі фінансаваньня капітальнага будаўніцтва і фінансаваньня зваротных фондаў.
17. Даручыць Дзяржпляну вывучыць пэрспэктывы Белдзяржснабу і ў зьвязку з гэтым пытаньне аб яго фінансавым становішчы.
18. Прыняць да ведама, што Камунбанк не падаў сваечасова свой крэдытны плян.
19. Запрапанаваць Лесбелу распрацаваць плян рэалізацыі прадукцыі на 4-ы квартал з тым, каб гэты плян быў зацьверджан 18/VII-г. г., выходзячы з максымальнай магчымасьці рэалізацыі гэтай прадукцыі.

**2486.** Даклад Белкапінсаюзу пра забясьпечаньне вытворчых прадпрыемстваў Белкапінсаюзу сырцом і гандлёвай сеткі яго таварамі. Дакл. т. Сьцепановіч. **Інд. 146/2.**

**2486.** Заслухаўшы даклад Белкапінсаюзу аб становішчы забясьпечаньня вытворчых прадпрыемстваў Белкапінсаюзу сырцом і гандлёвай сеткі яго таварамі, Эканамічная Нарада пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць, што пастановы СНК БССР за 12/VI—29 г. і 15/III—30 г. аб забясьпечаньні сыстэмы інвалiднай капярацыі сырцом—з боку ВСНГ і таварамі для гандлёвай сеткі (ларкоў і латкоў) з боку НК Гандлю—ня выконваюцца.
2. Запрапанаваць ВСНГ ужыць патрэбныя захады да нармальнага забясьпечаньня вытворчых прадпрыемстваў сыстэмы інвалiднай капярацыі сырцом, нараўне з саматужна-прамысловай капярацыяй.
3. Даручыць НК Гандлю зьвярнуцца ў НК Гандлю і ВСНГ СССР аб узьдзейнічаньні на тыя арганізацыі, якія не выконваюць сваіх дагавораў з Белкапінсаюзам на дастаўку сырцу (Саюзрасмасла, Скурсындыкат і інш:).
4. Абмеркаваць пытаньне аб канцэнтрацыі ў сыстэме інвалiднай капярацыі вырабу кардонных скрынак і іншых вырабаў, якія больш падыходзяць да працы інвалідаў.
5. Запрапанаваць НК Гандлю забясьпечыць сетку ларкоў і латкоў інвалiднай капярацыі рознымі таварамі, асабліва мясцовымі і недэфіцытнымі.

**2487.** Пра становішча дзяржаўнага бюджэту БССР і плацяжы Лесбелу. Дакл. т. Бунін. **Інд. 25/І.**

**2487.** 1. Дазволіць НК Фінансаў забраць ад Лесбелу тую гатовую прадукцыю, якая была яму перададзена ад Лесзагу і ў парадку дагляду за лесам, ці Лесбел павінен у тэрміновым парадку аплаціць завінавачанасьць бюджэту.
2. Дазволіць НК Фінансаў накласьці сэквестр на гатовую прадукцыю Лесбелу з тым, каб без візы НКФ нічога не адгружалася, а Ўсебеларускай Канторы Дзяржбанку ўнесьці на пакрыцьцё плацяжоў Лесбелу кошт усёй адгружанай прадукцыі Лесбелу.

**2488.** Пратэст „Экспартлесу“ на пастанову Эканамічнай Нарады пры СНК БССР пра арганізацыю ў БССР Канторы „Экспартлесу“. Дакл. т. Балцін. **Інд. 102/51.**

**2488.** 1. Адмяніць пастанову Эканамічнай Нарады пры СНК БССР за 28/V—1930 г. па гэтым пытаньні і дазволіць арганізацыю Беларускай Канторы „Экспартлесу“.
2. Запрапанаваць НК Гандлю разам з ВСНГ з прыцягненьнем Лесбелу і Ўпаўнаважанага „Экспартлесу“ вызначыць функцыі канторы „Экспартлесу“.

**2489.** Пратэст Усесаюзнага Пушсындыкату і Белдзяржгандлю на пастанову ЭКАНА за 18/V—30 г. „Пра арганізацыю пушной прамысловасьці“. **Інд. 162/96.**

**2489.** Перанесьці на наступнае пасяджэньне.

**2490.** Пратэст ВСНГ на пастаноўу ЭКАНА за 8/V-30 г. пра рэарганізацыю Белпайгандлю. Дакл. т. Луцкевіч. **Інд. 146/28.**

**2490.** Пакінуць у сіле пастанову Эканамічнай Нарады за 8/V-30-г. па гэтым пытаньні.

**2491.** Пра рэарганізацыю вышэйшых і сярэдніх школ. Падае Камісія СНК. Дакл. т. Бэнэк. **Інд. 135/45.**

**2491.** 1. Рэарганізаваць Лясны Факультэт Горацкай Сельскагаспадарчай Акадэміі ў Лясны Інстытут, які адчыніць у гор. Гомелі.
2. Рэарганізаваць факультэт жывёлагадоўлі Горацкай С.-Г. Акадэміі ў Зоатэхнічны Інстытут з астаўленьнем яго ў Горках.
3. Рэарганізаваць Мэдычны факультэт Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Мэдычны Інстытут з перадачаю яго пад ведама НК Аховы Здароўя.
4. Віцебскі мэханічны тэхнікум перадаць пад ведама ВСНГ БССР.
5. Перадаць пад ведама НК Земляробства ўсе сельскагаспадарчыя тэхнікумы.
6. Пакінуць Менскі палітэхнікум пад ведамам НК Асьветы.
7. Перадаць пад ведама НК Гандлю Мясны тэхнікум у Воршы і Рыбны тэхнікум у Жыткавічах.
8. Перадаць пад ведама НК Аховы Здароўя Магілеўскі мэдычны тэхнікум.
9. Перадаць пад ведама Белкапсаюзу Віцебскі каперацыйны тэхнікум з утрыманьнем яго за кошт капярацыі.
10. Перадаць адчыняемы ў гэтым годзе тэхнікум саматужнай прамысловасьці пад ведама ВСНГ.
11. Перадаць вячэрнія тэхнікумы і кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы кадраў па прамысловасьці пад ведама ВСНГ.
12. Увесьці ў склад камісіі, выдзеленай пастановаю СНК БССР за 2/VI-г. г. (прат. СНК № 42, п. 1940) замест т. Платуна—т. Бялугу і замест т. Гольдштэйна—т. Пятровіча ў зьвязку з іх ад'ездам у адпачынак.